картатэку нарматыўна-прававой дакументацыі, але і рэальныя кошт яе складання, акрамя таго, быў падлічаны кошт арганізацыі і правядзення дня інфармацыі, падрыхтоўкі і выдання бібліяграфічнага дапаможніка.

Бібліятэка становіцца часткай вытворчай структуры грамадства, бо валодае спецыфічным таварам, інфармацыяй, якая можа прадавацца па рыначнай цане. Платныя паслугі ўжо ўвайшлі ў структуру бібліятэчнага абслугоўвання, што выклікае неабходнасць пераарыентацыі навучання будучых бібліятэчных спецыялістаў. У працэсе лабараторных заняткаў студэнты авалодваюць методыкай распрацоўкі мадэлей платных бібліятэчна-інфармацыйных паслуг. У гэтых мадэлях прысутнічаюць такія моманты, як наяўнасць рэальнага і патэнцыяльнага запыту на паслугу, абгрунтаванае ўключэнне гэтай паслугі ў лік платных, змест самой паслугі, яе рэклама,неабходныя для яе ажыццяўлення матэрыяльныя , фінансавыя і працоўныя рэсурсы, мяркуемая эфектыўнасць паслугі і інш.

У ходзе выкладання курса ўлічваецца пераарыентацыя метадычнай дзейнасці па заказу, што патрабуе ад студэнтаў авалодання прыватнай методыкай складання метадычных дапаможнікаў. На практычных занятках кожны студэнт афармляе план-праспект метадычнага дапаможніка па адной з актуальных тэм у адпаведнасці з планамі навукова-метадычных цэнтраў.

Змены, якія адбыліся ў выкладанні курса, патрабуюць і змены яго назвы. Мэтазгодна курс назваць «Бібліятэчны мэнеджмэнт і маркетынг», што, на наш погляд, больш дакладна суадносіцца з мэтамі і задачамі гэтай бібліятэказнаўчай дысцыпліны. Удасканаленне выкладання курса звязана не толькі з пашырэннем выкарыстання разнастайных новых метадычных прыёмаў, але і з умацаваннем сувязі і ўзаемадзеяння бібліятэчнай адукацыі і бібліятэчнай практыкі.

Чаплыгіна Т.І.,
ст.выкладчык

## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНЫХ НАВЫКАЎ І ЎМЕННЯЎ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «АРГАНІЗАЦЫЯ, ЭКАНОМІКА І КІРАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВАЙ»

Работа па развіццю ўменняў і навыкаў у практычнай дзейнасці праводзіцца ў сістэме, асновай якой з'яўляецца паступовае павелічэнне самастойнасці студэнтаў. Яна здзяйсняецца шляхам удасканалення заданняў, а таксама шляхам змянення ролі і кіраўніцтва выкладчыка пры выкананні гэтых заданняў.

У працэсе выкладання вучэбнага матэрыялу шырока выкарыстоўваюцца наглядныя дапаможнікі і матэрыялы з практыкі работы бібліятэк рэспублікі.

На ўсіх занятках вельмі важна падрыхтаваць студэнтаў да ўспрымання плануемага матэрыялу. Так, напрыклад, пры вывучэнні тэмы «Нарміраванне бібліятэчных працэсаў» выкладчык тлумачыць студэнтам значнасць матэрыялу, які ўключае даная тэма на сучасным этапе, ролю розных нормаў у практыцы работы бібліятэк, у вызначэнні планавых заданняў, колькасці бібліятэчных супрацоўнікаў і інш.

Сур'езная ўвага ўдзяляецца кантролю вынікаў практычных работ..Якім бы простым ні з'яўлялася заданне, яго трэба прааналізаваць. Рэгулярная праверка практычных работ дае магчымасць своечасова ліквідаваць памылкі, прабелы ў ведах, уменнях студэнтаў, дапамагае высветліць, у якім аб'ёме студэнты зразумелі і засвоілі вывучаемы матэрыял. Асабліва гэта неабходна ў час правядзення лабараторных заняткаў па тэмах «Бібліятэчная тэхналогія», «Нарміраванне бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў», «Фінансава-эканамічнае забеспячэнне бібліятэк» і інш.

На лабараторных занятках па тэме «Складанне гадавога плана работы бібліятэкі» студэнты выкарыстоўваюць веды, набытыя ў працэсе вывучэння такіх курсаў, як «Бібліятэчныя фонды», «Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў», «Арганізацыя бібліятэчна-бібліяграфічнага і інфармацыйнага абслугоўвання чытачоў». Гэта дае магчымасць якасна аформіць наступныя раздзелы гадавога плана: «Арганізацыя абслугоўвання чытачоў і прапаганда твораў друку», «Арганізацыя фондаў і каталогаў», «Даведачна-бібліяграфічная і інфармацыйная работа».

Добрыя практычныя навыкі набываюць студэнты пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў. Поспех дасягаецца дзякуючы комплекснаму падыходу, які прадугледжвае найбольш поўную рэалізацыю ўсяго шырокага кола функцый і задач самастойнай работы ў ходзе падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў і ў працэсе іх правядзення. Выкарыстоўваюцца такія формы, як разгорнутая гутарка, вусны даклад, дыскусія, дзелавая гульня, гутарка за круглым сталом, разгляд дзелавых сітуацый, прэс-канферэнцыя. Выкарыстанне дадзеных формаў прадугледжвае распрацоўку метадычна прадуманай сістэмы заданняў з улікам асаблівасцей тэмы, спецыфікі студэнцкай групы.

Вельмі важным з'яўляецца ўзаемасувязь семінарскіх заняткаў з іншымі формамі вучэбна-выхаваўчага працэсу: практычнымі і лабараторнымі заняткамі, вучэбнай і вытворчай практыкай, тэарэтычнымі студэнцкімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канферэнцыямі, курсавымі і дыпломнымі работамі.

Для ўстанаўлення атмасферы творчасці, зацікаўленага, актыўнага абмеркавання вывучаемага матэрыялу выкарыстоўваецца пастаноўка праблемных пытанняў. Пры гэтым галоўнае, каб былі сфармуляваны пазнавальныя задачы, якія арыентуюць студэнта на актыўнае засваенне прадмета.

Замацаванне вывучанага матэрыялу здзяйсняецца ў час вытворчай практыкі ў бібліятэках розных сістэм і ведамстваў рэспублікі.

Касап В.А.,
дацэнт

## УДАСКАНАЛЕННЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «ДАКУМЕНТАЗНАЎСТВА»

Адна з сучасных тэндэнцый фарміравання вучэбных дысцыплін у ВНУ - гэта стварэнне інтэгратыўных курсаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам ў 1989 годзе на факультэце БІС быў распрацаваны і пачаў выкладацца новы курс «Дакументазнаўства». Яго неабходнасць была выклікана некалькімі прычынамі: 1) немагчымасцю на сучасным этапе весці падрыхтоўку бібліятэкараў, якая грунтуецца на веданні толькі традыцыйных дакументаў; 2) кніга ўжо не магла выконваць функцыі абагульняючага аб'екта ў сістэме дакументальных камунікацый у сувязі са з'яўленнем вялікай колькасці нетрадыцыйных дакументаў; 3) у шэрагу навучальных устаноў рабіліся спробы распрацаваць абагульняючы курс; 4) на старонках прафесійных выданняў праводзіліся дыскусіі аб сучасных напрамках падрыхтоўкі бібліятэкараў, у т.л. і ў галіне дакументальных крыніц інфармацыі; 5) павялічылася колькасць скаргаў выкладчыкаў, якія працуюць на старэйшых курсах, на недахопы падрыхтоўкі студэнтаў па курсу «Кнігазнаўства».

Спачатку курс будаваўся як дапаўненне да курса «Кнігазнаўства» і быў разлічаны на 20 гадзін. Далейшая яго перабудова была звязана з перабудовай курса «Кнігазнаўства і гісторыя кнігі», яго дзяленнем на 2 самастойных: «Дакументазнаўства» і «Гісторыя беларускай і сусветнай кнігі». Зараз курс «Дакументазнаўства» разлічаны на 40 гадзін, яго вывучэнне заканчваецца залікам.

У наш час курс «Дакументазнаўства» яшчэ не заняў адпаведнага месца ў вучэбных планах розных ВНУ. Яго выкладанне вядзецца з улікам розных прынцыпаў, у розных ВНУ на яго адводзіцца і розная колькасць гадзін. Напрыклад, у Маскоўскім інстытуце культуры ён разлічаны на 72 гадзіны і прадугледжвае набыццё ведаў аб тэарэтычных пытаннях дакументазнаўства, аб кнізе, перыядычных выданнях, патэнтнай, нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі, неапублікаваных дакументах, аўдыёвізуальных і архіўных дакументах.

У Маскоўскім гуманітарным універсітэце курс «Дакументазнаўства» выкладаецца на розных спецыялізацыях і разлічаны на 140 гадзін. Гэты курс ставіць на мэце знаёмства студэнтаў у асноўным з гістарычнымі і архіўнымі дакументамі і методыкай іх складання.

У Кішынёўскім універсітэце, некаторых інстытутах Расіі курс «Дакументазнаўства» прадугледжвае перш за ўсе засваенне студэнтамі ведаў аб розных дакументах у сістэме дакументальных камунікацый, а таксама дакументах справаводства.

Змест курса, які выкладаецца ў Беларускім універсітэце культуры, пабудаваны такім чынам, каб даць веды студэнтам аб асноўных пытаннях тэорыі дакументазнаўства, асноўных комплексах дакументаў: кнігах, перыядычных выданнях, нарматыўна-тэхнічных і тэхнічных дакументах, неапублікаваных, аўдыёвізуальных, машыначытальных, картаграфічных.

Лабараторныя заняткі накіраваны на замацаванне ведаў і набыццё навыкаў і ўменняў выдзялення структурных частак дакументаў, знаёмства з асаблівасцямі афармлення, класіфікацыяй розных дакументаў і інш.

Для далейшага ўдасканалення выкладання курса «Дакументазнаўства» неабходна абмежавацца толькі дакументамі сістэмы дакументальных камунікацый; распрацаваць раздзел «Гісторыя развіцця розных відаў дакументаў». Трэба, каб набытыя веды па гэтаму курсу пашыраліся потым у бібліятэказнаўчых і бібліяграфічных дысцыплінах.

Грынчык М.М.,
прафесар

## РОЛЯ СПЕЦКУРСА ПА ЛІТАРАТУРЫ Ў ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ СТУДЭНТАЎ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Вывучэнне айчыннай гісторыі, мовы, літаратуры, фальклору - аснова гуманітарна-філалагічнай падрыхтоўкі будучых працаўнікоў культуры. Гэтыя дысцыпліны ўзбройваюць студэнтаў канкрэтнымі ведамі, паглыбляюць маральную матывацыю абранай прафесіі, дапамагаюць вызначыць найбольш плённыя перспектывы творчай дзейнасці. Менавіта спецкурс па той ці іншай праблеме агульнага курса па гісторыі нацыянальнай літаратуры актывізуе індывідуальную работу студэнта, узмацняе яго



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ